# ПЕРШАМАЙСКАЕ ПРЫВІТАННЕ СЛАЎНАМУ КАЛЕКТЫВУ БДУ!

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 15 (257) | Аўторак, 1 мая 1956 года. | Цана 20 кап.




## ДЗЕНЬ ДОБРЫ, МАЙ!

Дзень добры, май!
Твой жыватворны подых
Я чую зноу. Без перашкод і меж
Ідзеш ты па гарах і водах,
Ідзеш і промні светлыя нясеш.
Налева кінеш—зацвітаюць вішні,
Направа—зелянее луг.
Па ніве пройдзеш—сеяць, глядзіш, выйшлі,
І зіхаціць раллёй сагрэты плуг.
І у кожным сэрцы, маладым і чулым,
Мацней жаданне у гэты час гарыць
Перад жывым маёвым гулам:
І марыць, і смяяцца, і любіць.
Што-ж, на зямлі ёсць радасцей багата,
А больш за усё іх ведае мой край.
Дзень добры, наша сонечнае свята!
Дзень добры, наш вясёлы Першамай!

Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

## НАС ЧАКАЮЦЬ ВЯЛІКІЯ СПРАВЫ

На долю нашага выпуску выпала вялікае шчасце: мы едзем працаваць у такі час, калі совецкія людзі, натхнёныя рашэннямі XX з'езду КПСС, з вялікім уздымам ажыццяуляюць планы шостай пяцігодкі.

Я і большасць маіх таварышау-аднакурснікау (Садзюкевіч, Русецкі, Іваноу і іншыя) едзем працаваць у сельскую мясцовасць. І кожны з нас ужо цяпер думае аб пачэснай і адказнай ролі настауніка, будуе планы будучай работы у школе, марыць, як можна больш прынесці карысці свайму народу. Прауда, у комсамольскай сям'і нашага курса знайшліся людзі, якія адмовіліся ехаць працаваць туды, дзе яны найбольш патрэбны. Гэта Аляксашына, Ідчак, Красноускі, Курылава, Кандакова, Лапцэвіч, Паддубная. Дробныя, эгаістычныя інтарэсы, клопаты толькі аб сабе, страх «бескультур'я» нашай вёскі—вось што перашкаджае ім выконваць свой абавязак.

Я-ж лічу, што маё месца у вёсцы. Там мяне, як і маіх аднакурснікау, чакае настойлівая работа у імя далейшага росквіту соцыялістычнай Радзімы.

**В. ІВАШКЕВІЧ,**
**студэнт V курса фізмата.**

## Захапляючыя лекцыі

На нашым курсе у групе оптыкау доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Барыс Іванавіч Сцяпанау чытае спецкурс па спектраскапіі. Нягледзячы на складанасць спецкурса, лекцыі Барыса Іванавіча заусёды жывыя і захапляючыя. Новы матэрыял багата ілюструецца рознастайнымі прыкладамі з практычнай спектраскапіі.

Б. І. Сцяпанау прыцягвае да удзелу у лекцыі студэнтау усёй групы шляхам пастаноукі пытанняу, адказы на якія, няхай гэта тэарэтычныя або разліковыя, патрабуюць ведання раней прачытанага матэрыялу і кемлівасці. Усё гэта дазваляе нам глыбей унікнуць у сэнс вывучаемага курса.

Узнікшыя пытанні па матэрыялу вырашаюцца адразу-ж у ходзе тлумачэння, што дае магчымасць нам не пакідаць сумненняу або няпоуных уяуленняу аб тэме.

Лекцыі па спектраскапіі праходзяць цікава і захапляюча. Студэнты на іх заусёды уважлівыя і старанныя.

**Е. ВАСІЛЬЕЎ,**
**студэнт IV курса аддз фізікі.**

## У лектарскай групе БДУ

Елену Яновіч—аспірантку універсітэта—абкружылі рабочыя. Сыплюцца пытанні. Яна падрабязна адказвае на іх. Сёння давялося многа пахваляваццa: прачытаць лекцыю на заводзе—адказная справа. Таму Лена заусёды старанна рыхтуецца да кожнага выступлення.

У лектарскай рабоце універсітэта прымаюць актыуны удзел і аспіранты Касцюкевіч, Крыловіч, Тамільчык. Яны часта выступаюць з дакладамі на заводах, ва ўстановах і школах.

У складзе лектарскай групы многа студэнтау. Алег Сцепаненка, Лора Краснеуская з'яуляюцца не толькі лектарамі, але і добрымі арганізатарамі. Вялікімі поспехамі карыстаецца студэнтка біяфака Іра Фрыд; расказваючы аб творчасці Бетховена, яна сама выконвае на фартэпіяна творы геніяльнага кампазітара-сімфаніста.

**Я. ЯНОВІЧ.**

## СВЯТА НАРОДА—СТВАРАЛЬНІКА

Сёння па вясновых святочных вуліцах пройдуць мільёны совецкіх людзей—будаунікоу комунізма. Цесна самкнутыя рады дэманстрантау, вясёлыя твары, бясконцыя калоны рабочых, калгаснікау, студэнтау і вучнёускай моладзі. Такім будзе наш Першамай. З законнай гордасцю за нашы велічныя перамогі адзначым мы сёння дзень міжнароднай пролетарскай салідарнасці працоуных, дзень братства рабочых усіх краін.

Рыштаванні новабудоуляу, яркія агні новых электрастанцый, трасы многаводных каналау, сотні кілометрау новых чыгунак. Новыя вузы, школы, бібліятэкі, яслі, новыя здабыткі у тытанічнай працы —вось наш баявы рапарт у дзень вялікага міжнароднага свята. Працоуных усяго свету глыбока радуюць і хвалююць найвялікшыя перамогі соцыялізма, які выйшау за рамкі адной краіны і ператварыуся у міравую сістэму.

Соцыялізм непераможна ідзе наперад. Ён не ведае крызісау, спадау, ён наглядна дэманструе свае перавагі над старым, капіталістычным светам. Ідэі соцыялізма становяцца уладарамі дум усяго працоунага чалавецтва.

Совецкі народ пад кіраунiцтвам заснаванай вялікім Леніным Комуністычнай партыі геральна змагаецца за ператварэнне у жыццё велічных задач далейшага руху да комунізма, намечаных XX з'ездам КПСС.

Галоуная мэта, самае гарачае наша жаданне—мірна жыць і працаваць, жыць у дружбе з усімі народамі. Мы высока нясем сцягі міру і дружбы, і мы не перастанем нясці іх наперад!

Радаснымі калонамі пройдзе сягоння міма трыбун совецкае студэнцтва. Пройдуць будучыя інжынеры і тэхнікі, будучыя настаунікі і аграномы, будучыя медыцынскія работнікі і разведчыкі зямных нетрау. Сёння поле іх дзейнасці—кніга і лабараторыя, барацьба за авалоданне ведамі, без якіх нельга будаваць новае жыццё. Гэта да іх, маладой змены, заутрашніх будаунікоу комунізма, звяртаецца ЦК КПСС з заклікам:

**— Юнакі і дзяучаты, наша слаўная моладзь! Актыуней удзельнічайце у гаспадарчым і культурным будаунiцтве! Вывучайце дасягненні перадавой навукі і тэхнікі, авалодвайце ведамі прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці! Будзьце стойкімі і смелымі у барацьбе за перамогу вялікай справы комунізма у нашай краіне!**

Совецкі народ горача вітае дасягненні нашых вучоных, нястомных барацьбітоу за прагрэс навукі, за высакародную справу падрыхтоукі маладых спецыялістау. Нашай краіне належыць першае месца як у справе новых найвялікшых адкрыццяу, прагрэсу навукі, так і у справе падрыхтоукі кадрау совецкай інтэлігенцыі, якая авалодвае дасягненнямі перадавой совецкай навукі і тэхнікі.

Совецкія людзі, звяртаючыся да навуковых работнікау, у гэты дзень заклікаюць:

**— Работнікі навукова-даследчых установ і вышэйшых навучальных установ! Рухайце наперад совецкую навуку, паляпшайце падрыхтоуку спецыялістау, павышайце ролю навукі у тэхнічным прагрэсе нашай краіны!**

Па вуліцах і плошчах нашай краіны пройдуць сёння совецкія людзі з радасным усведамленнем сваіх велічных перамог, з глыбокай верай у таржаство вялікай справы будауніцтва комунізма.

## Дай руку, таварыш далёкі...

Мацнее дружба паміж моладдзю розных краін свету. Іх аб'ядноувае адзінае жаданне—жыць у міры, радасці і шчасці. Гэта адчуваецца у іх справах, у пісьмах, якія яны шлюць да сваіх далёкіх сяброу.

Студэнты нашага універсітэта перапісваюцца з моладдзю многіх краін свету. На адрас БДУ прыходзяць пісьмы з Польшчы і Чэхаславакіі, Індыі і Кітая, Румыніі і многіх іншых краін.

Нядауна студэнты II курса аддзялення журналістыкі завязалі перапіску са студэнтамі Іенскага універсітэта. Ніжэй мы расказваем аб гэтай перапісцы.



Нашы студэнты расказваюць аб сваім жыцці. Цёпла, сардэчна пішуць яны аб вечарах, якія праводзіліся на нямецкай мове, аб тым, з якой вялікай цікавасцю чытаюць студэнты БДУ літаратуру Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Яны просяць нямецкіх сяброу расказаць аб сваім жыцці. «Нам вельмі цікава даведацца аб вашым жыцці, вучобе і адпачынку. Просім вас расказаць аб гэтым»,—пішуць студэнты БДУ.

Студэнты-журналісты перадаюць гарачае комсамольскае прывітанне моладзі ГДР і пажаданні самых найлепшых поспехау у іх жыцці і рабоце.

*С. ВЛАДЗІМІРАЎ.*

*На здымку: студэнты II курса аддз. журналістыкі пішуць пісьмо нямецкім сябрам.*

**Фото Э. ДАМАРАЦКАГА.**

Нашы студэнты паслалі віншавальную тэлеграму студэнтам Іенскага універсітэта у сувязі з дзесяцігоддзем універсітэта. У сваім адказным пісьме нямецкія сябры шчыра падзякавалі за віншаванне і выразілі пажаданне і надалей працягваць сяброўскую перапіску.

Адказ на гэтае пісьмо далі студэнты II курса аддзялення журналістыкі.

## На прыз газеты „БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ“

25 красавіка быу дадзены старт веснавой лёгкаатлетычнай астафеты на прыз газеты «Беларускі універсітэт». У ёй прымалі удзел каманды пяці факультэтау: не было каманды біёлага-глебавага і гістарычнага факультэтау.

...Старт. З першых метрау наперад вырываецца прадстаунік каманды філфака В. Макарэвіч. Ён першым перадае астафету Т. Блахіной, якая яшчэ больш адрываецца ад сапернікау. Але на наступных этапах намаганнямі членау каманды геафака А. Кляцунова і В. Кісліка наперад выходзіць каманда геафака.

Першае месца у эстафеце, якая складалася з 12 этапау, заняла каманда геолага-геаграфічнага факультэта з вынікам 19 мінут 5 секунд (працягласць усёй дыстанцыі— 6 кілометрау). Другое месца заняла каманда фізмата— 19 мінут 53 секунды, і трэцяе— філфака—20 мінут 05 секунд.

Камандзе-пераможцу будзе уручаны пераходны прыз газеты «Беларускі універсітэт».

**І. ДОНАЎ.**

# Неспакойнае сэрца

Было ужо каля поўначы, калі Клім вяртауся дадому.

«Пазнавата,—думаў ён,—а работы яшчэ многа: трэба законспектаваць матэрыялы XX з'езда партыі, падрыхтаваць і замежную мову, і латынскую... А пасяджэнні... Амаль кожны дзень...»



Хлопцы жартавалі, калі ён прыходзіу дамоу позна. Але юнак ніколі не крыудзіуся і звычайна на жарт адказвау жартам. Так было і на гэты раз.

— Глядзіце, Клім сёння нешта надзвычай вясёлы. Ці не закахауся ён?

— Ды дзе там... Хіба можа ў «Анну Карэніну»?

— Якраз угадалі,—згадзіуся Клім,—ішла там нейкая Аня. Я яе нават праводзіу...—сказау ён і, гледзячы на здзіуленыя позіркі сяброў, дадау:—вачыма.

Хлопцы дружна засмяяліся.

І калі у пакоі станавілася ціха, Клім садзіуся за стол і пачынау працаваць. Зрэдку ён паглядау на гадзіннік, на твары таварышаў, якія, напэуна, ужо бачылі дзесятыя сны. Яму і самому хацелася адпачыць, але-ж яшчэ не усё зроблена. А прыйсці на заняткі непадрыхтаваным ён не можа. Не такі характар у Кліма.

Такім яго ведаюць і аднакурснікі, і сябры па пакою. Такім ён быу і ў Глыбоцкім педвучылішчы. Можа тады Клім і не думау аб універсітэце, але затое ён цалкам аддавауся вучобе, грамадскай рабоце. Юнак ніколі не зазнаваўся, ніколі не спыняўся на дасягнутым. У гэтай рабоце ён знаходзіу нейкае асаблівае задавальненне, адчувау, што кожны дзень прыносіць яму штосьці новае. І ён працавау яшчэ з большай энергіяй.

На апошнім курсе педвучылішча Клім уступіу у рады Камуністычнай партыі і скончыу вучобу з дыпломам выдатніка. Можна было ехаць працаваць, але юнак адчувау, што ведае яшчэ вельмі мала, каб быць сапраўдным совецкім педагогам. Клім Кажан паступіў ва ўніверсітэт на аддзяленне рускай мовы і літаратуры.

З першых-жа дзён вучобы ён настойліва ўзяуся за справу. Аднакурснікі неяк адразу палюбілі гэтага крыху маукліваага, заусёды сур'ёзнага юнака. Яго выбралі членам комсамольскага бюро і даручылі кіраваць палітыка-выхаваўчай работай на факультэце. З душой, з аганьком узяўся ён за работу. Трэба правесці падпіску на газеты і часопісы, арганізаваць даклады на розныя тэмы, паклапаціцца аб культпаходах і дыспутах. Многа работы у Кліма, але ён не забывае і аб вучобе. Першую экзаменацыйную сесію здау выдатна. Старанна працуе ён і цяпер. Рэгулярна рыхтуецца да семінарскіх заняткау, акуратна канспектуе першакрыніцы, чытае мастацкую літаратуру. Клім Кажан ніколі не супакойваецца на дасягнутым. Яму здаецца, што зроблена яшчэ зусім мала, што можна зрабіць значна больш. І нездарма некаторыя гавораць, што у яго неспакойнае сэрца.

**В. СКАПА,**
**В. САЛАНОВІЧ.**

# Ажыццёўленная мара

У кожнага чалавека ёсць свая добрая і светлая мара. Яна вядзе яго да пэунай мэты.

Яшчэ на школьнай парце я марыла стаць настаўніцай. Мне здаецца, што гэта прафесія самая высакародная, самая добрая і самая адказная. Закончыўшы школу з залатым медалем, я паступіла на аддзяленне рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта.

1-га Мая у гэтым годзе я буду святкаваць з вялікай радасцю, бо я ужо ажыццяуляю сваю мару, вучуся ва універсітэце.

Я вельмі шчаслівая, што жыву у Совецкай Беларусі і маю права на асвету. Мае бацькі, знаходзячыся пад прыгнётам былой панскай Польшчы, аб гэтым не маглі нават і думаць.

Мне хочацца падзякаваць нашу партыю і урад за клопаты аб нас, маладых людзях краіны.

Лепшай падзякай за гэтыя клопаты ў сучасны момант будзе мая добрая і выдатная вучоба ва універсітэце, а у будучым—плённая праца па выхаванню маладога пакалення.

**Н. ХРЭНОУСКАЯ,**
**студэнтка I курса філфака.**

# ГОСЦІ З ЛІТВЫ

Нядауна да нас ва ўніверсітэт прыязджалі нашы сябры—студэнты чацвертага курса эканамічнага факультэта Вільнюскага універсітэта. Яны пабывалі на трактарным заводзе, на аутазаводзе, на фабрыцы імя Кагановіча, дзе знаёміліся з вытворчымі працэсамі, з навейшай тэхнікай. У Рускім драматычным тэатры імя А. М. Горкага яны глядзелі спектакль «Кароль Лір», у Беларускім дзяржауным тэатры оперы і балету—балет «Лебядзінае возера». Упершыню пазнаёміліся яны з шырокаэкраннымі фільмамі.

Многа цікавага убачылі сябры у заалагічным музеі нашага універсітэта. Цёпла сустрэлі іх студэнты. Комсорг курса В. Кантрымавічус падзяліуся сваімі планамі, расказаў аб вучобе, навуковай рабоце нашых літоускіх сяброу.

Потым, калі праводзілі іх нашы студэнты дадому, сябры вельмі дзякавалі за усё, прасілі прыязджаць да іх ва універсітэт. Трымаць цесную сувязь, быць сябрамі назаусёды—вось якія думкі не пакідалі ні нас, ні нашых сяброу з Літвы.

**І. ЯНУКОЎ.**

# ДА ВЫНІКАЎ АГЛЯДУ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

21 і 22 красавіка праходзілі заключныя канцэрты агляду факультэцкай самадзейнасці БДУ імя В. І. Леніна.

58-я аудыторыя перапоунена. Канцэрт пачынае хор БДУ цыклам песень рэволюцыйнага падполля.

Усе калектывы і асобныя выканауцы выступілі у гэтым годзе з новай праграмай. Да ліку лепшых нумароў факультэцкіх хорау трэба аднесці песні Рубінштэйна «Горные вершины» (біяфак), Дунаеускага «Не забывай» (філфак), Хрэннікава «Студенческая» (юрфак), Радыгіна «Едут новоселы» (фізмат).

Лепш за усіх выступіу хор гістфака. У выкананні песень «Мы—молодёжь» Феркельмана і «Встречай, земля сибирская» Носава, а асабліва «Соловушки» Глінкі адчуваецца сапрауднае майстэрства дырыжора і акампаніятара.

Вялікі поспех заваявалі танцавальны калектыу, хор і аркестравая група геафака, якія выконвалі беларускія народныя танцы «Бульбу» і «Янку». Факультэцкі ансамбль у БДУ арганізаваны упершыню, і было-б вельмі добра, каб гэтае новаўвядзенне падхапілі і іншыя факультэты.

Калі на мінулагоднім аглядзе было многа творау совецкіх кампазітарау, то цяпер, акрамя папулярных песень з кінофільмаў, гучэлі рамансы Глінкі, Рахманінава, музыка Бетховена, Рубінштэйна, Вагнера, Брамса, Грыга.

Сярод лепшых музыкальных нумароу «Итальянская полька» Рахманінава (інструментальны ансамбль гістфака), «Патетическая соната» Бетховена (студ. фізмата Савельева), «Соната № 5» Бетховена (студ. хімфака Шкляр), старадауні раманс «Я встретил вас» (студ. фізмата Волк-Левановіч), рускія песні (студ. філфака Баута) і два рамансы Глінкі (студ. філфака Пераверзева).

У традыцыю увайшло выступленне універсітэцкіх паэтау з чытаннем сваіх новых вершау.

Авацыяй сустрэлі прысутныя «Куплеты на надзённыя тэмы» Э. Калядэнкі і Г. Кузьмічэнкі.

Меладэкламацыя Кандрашовай («Легенда о Марко» Горького) і выдатная дэкламацыя Пашкевіч («Первая поэма» Алигер) ужо дауно заваявалі прызнанне студэнтау.

Большасць нумароў паказалі, што у нас ёсць многа здольных і таленавітых людзей. Праўда, часта адсутнічае уменне правільна прымяняць свой талент. Многія бяруць творы, якія ім не па сілах. Спевакі часта дрэнна слухаюць акампаніятара. У «Маршы совецкіх патрыётау» Мурадэлі (хор фізмата) баян зусім заглушае жаночую партыю. Некаторыя дэкламатары (студ. геафака Аляксеева) робяць многа няправільных націскау. Ва усіх гэтых выпадках вялікую дапамогу павінны аказаць кіраунікі музыкальных і драматычных калектывау.



*НА ЗДЫМКУ: танцавальны калектыу юрфака выконвае «Малдаускі танец».*
Фото Г. ПРАВАЛОВІЧА.

# У СТУДЭНТАЎ-ФІЗІКАЎ

Рана абудзіуся у гэты дзень, як і заусёды, інтэрнат корпуса «Б» па вуліцы Бабруйскай. Захлопалі дзверы, зашоргалі паспешныя крокі, паляцелі галасы прывітанняу—з новай сілай забіу у пакоях, на калідорах пульс жыцця.

Але вось ужо усё сабрана, падрыхтавана да заняткау; групамі і па-аднаму спяшаюцца студэнты на лекцыі, семінары, практычныя і лабараторныя заняткі.

— Эх, і цудоуная-ж раніца, вы паглядзіце толькі,—гаварыу студэнт чацвертага курса аддзялення фізікі Нікалай Аляхновіч аднакурсніцам Тамары Якубенка і Яніне Лінец, што ішлі побач з ім, і паказвау на залітыя сонцам карпусы універсітэцкага гарадка, на застыўшы ва урачыстай ранішняй цішы сквер.

— Вясна... Зноу прышла да нас наша вясёлая, працоуная вясна, Коля,—сказала з нейкай асаблівай радасцю Тамара і адчыніла дзверы фізіка-матэматычнага корпуса.

Сёння панядзелак—дзень лабараторных заняткау у фізікаў-чацверакурснікау. Яніна, прышоўшы у лабараторыю, хутка падрыхтоувае аловак і сшытак для запісау. Тамара правярае схему, уключае прыборы. Пачынаецца работа па вывучэнню ёмістасці поуправаднікоу пры дапамозе электроннага асцылографа. Гэта новы, яшчэ амаль не даследаваны метад. Студэнткі распрацоўваюць яго для прымянення на маскоускім поуправаднiковым заводзе, які ужо многа год трымае цесную сувязь з кафедрай агульнай фізікі фізіка-матэматычнага факультэта нашага універсітэта. Справа у тым, што спосаб, якім завод вымярае ёмістасць выпускаемых ім-жа поуправаднікоў, вельмі складаны і абыходзіцца заводу надзвычай дарага.



Прадстаўнікі завода звярнуліся зімой гэтага года пасля канферэнцыі па поуправаднiках у Маскве да студэнтау фізмата з просьбай распрацаваць новы, больш просты і танейшы спосаб вымярэння ёмістасці поуправаднікоў. Рашыць важную праблему ахвотна узяліся студэнты чацвертага курса факультэта.

І вось зараз, акрамя Тамары і Яніны, у гэтай-жа і у суседняй лабараторыях працуюць пад кіраўніцтвам дацэнта Ільі Грыгор'евіча Некрашэвіча Марыя Акуліч і Людміла Блінец, Аня Падвінская і Ліда Праташчык, Вера Шчарбакова і іншыя. Праўда, дзяучаты рашаюць задачу па-рознаму. Марыя і Людміла, напрыклад, вымяраюць ёмістасць поуправаднікоу метадам люстранога гальванометра, Вера даследуе уплыу рэнтгенавых промняу на поуправаднікі, Аня і Ліда вывучаюць з'явы прыбою селенавых выпрамнікау.

Многа сілы, волі і упартасці патрабуе нялёгкая работа даследчыка. Вось Марыя і Людміла ужо можа дзесяты раз уключаюць гальванометр, але стрэлка яго, уздрыгнуўшы, застаецца на месцы. На шчасце, у лабараторыю праведаць дзяучат зайшоу Коля Аляхновіч. Юнак карыстаецца сярод аднакурснікау павагай і аутарытэтам. Ён староста курса, рэдактар бюлетэня СНТ, а нядауна закончыу цікавейшую даследчую работу.

Коля знайшоу сплавы металаў, якія мала разбураюцца пры апрацоуцы, і працэс электраіскравага разрада, пры якім электрод-«інструмент» разбураецца нязначна пры максімальным разбурэнні апрацоуваемай дэталі. Яго работа накіравана на гарадскі агляд студэнцкіх навуковых работ.

— Ну, дык як справы у вас, аднакурсніцы? — усміхнуўшыся, спытау Нікалай.

— Ды вось не ладзіцца штосьці з гальванометрам, а прычыны не можам знайсці. Паглядзі, калі ласка,—сказала Марыя.

Коля схіліуся над прыборамі, і праз некалькі мінут прычына была знойдзена. Аказваецца, патрэбен быу аутаматычны пераключацель тока. Зрабілі ключ для гэтай мэты, і затрымка у рабоце была ліквідавана.

Экзамены не за гарамі. У летнюю экзаменацыйную сесію чацверакурснікам трэба здаць квантавую механіку, спецкурс па электроннай тэорыі металау, дыямат і палітэканомію. А каб не здавалася экзаменацыйнае крэсла электрычным, яны ужо цяпер праглядаюць канспекты, ходзяць на кансультацыі па квантавай механіцы, робяць лабараторныя даследаванні па спецкурсу і чытаюць творы класікау марксізма-ленінізма.

Але не увесь-жа час сядзець за кнігай ці у лабараторыі. І вось зноу чуецца голас Ліды Праташчык—нястомнага арганізатара курса.

— А што, калі мы на 1 Мая зробім маёуку? Нядрэнна, праўда?

— Лідачка, ты геній,—па-сяброуску паціскаючы дзяучыне руку, гаворыць Коля Аляхновіч.

— Маёуку? Абавязкова наладзім,—згаджаюцца усе.

І можна быць упэуненым, што маёука у студэнтау IV курса аддзялення фізікі адбудзецца, што яны студэнцкую вясну сустрэнуць добра, а пасля першамайскіх свят з новымі сіламі возьмуцца за работу.

Так дружна, дапамагаючы адзін аднаму, жывуць і вучацца чацверакурснікі фізмата. Іх сапраудная дружба дапамагае ім рыхтавацца да экзаменау.

**В. ПАЎЛОВІЧ,**
**В. МАКАРЭВІЧ.**

*На здымку: Л. Праташчык (злева) і Т. Якубенка ў лабараторыі.*
*Фото Г. Праваловіча.*

# СВЯТОЧНЫ ГУМАР

## СЯБРОЎСКІЯ ШАРЖЫ

*Профессор Гуторов И. В.*



*Полвека за плечами у него сейчас,*
*Но полон сил он, как и прежде.*
*И мы томим, томим себя в надежде,*
*Что новои книгою порадует он нас.*

*Профессор Винберг Г. Г.*



*В университете прошёл слух*
*(Ему все рады очень были),*
*Что рыбы Винбергу за труд*
*Благодарность объявили.*

*В. Титок—студент IV курса истфака.*



*Что можно рассказать о нём:*
*Бегун сильнейший, чемпион...*
*И учится отлично он.*

## З ВЕСНАВЫМ ПРЫВІТАННЕМ!

«З веснавым прывітаннем!» Гэты вокліч нясецца зараз адусюль. Людзі сустракаюцца і вітаюць так адзін аднаго; здаецца, што нават птушкі выводзяць яго сярод ветак, якія яшчэ не распусціліся. У гэтыя дні хочацца спяваць і весяліцца.

Мы стаялі у скверыку універсітэта, любаваліся прыродай.

І раптам бачым: выходзіць з-за кустоў стройная дзяўчына. На галаве яе вянок, на нагах—чырвоныя боцікі. Ідзе прама да нас і усміхаецца. Мы адразу здагадаліся: Вясна! Такою не раз малявалі яе нашы мастакі. Падыходзіць яна да нас і гаворыць:

— Чула вашы заклікі... Давайце-ж паглядзім, як вы да маёй сустрэчы падрыхтаваліся. Што добра—не трэба паказаваць: у вас яго многа.

— А дрэннага у нас няма,—хутка запэўніў яе Бандарэнка. Вясна паказала яму на скульптурную групу ля фантана. Юныя фізкультурнікі дакорліва глядзяць на нас. Небаракі, каторы год стаяць яны вось так—раздзетыя, з перабітымі рукамі і нагамі. Некалькі разоў гаспадарнікі запэўнялі, што «вылячаць» фізкультурнікаў і адрамантуюць ім вопратку. Ды слова даць лягчэй, чым выканаць яго, а кантраляваць іх некаму: самі гаспадары. Акрамя таго, фігуры каменныя, яны і пацярпець могуць год—другі.



Але гэта дробязі. Давайце лепш зойдзем у корпус. Зайшлі.

У гэты час кінулася нам у вочы вялікая аб'ява. «Увазе балельшчыкаў філфака! Сёння першынство па плаванню!»

—Трэба знайсці спартсменаў...

На жаль, гэта доўга не удавалася нам. Заглянулі у кабінет эканомгеаграфіі. Тут сабраліся лабаранткі усяго хімкорпуса і з захапленнем абмяркоўвалі апошнія моды. Адрываць іх ад такога прыемнага правядзення часу нам не хацелася, тым больш, што іх і так турбавалі студэнты сваімі патрабаваннямі вярнуцца на свае рабочыя месцы.

Тады мы накіраваліся да студэнткі 5-га курса гістарычнага факультэта В. Кажэўнікавай. Яна размаўляла з невысокім хлопцам. Вочы яе выражалі поўную пагарду да свайго субяседніка. Сярод слоў яе часта былі такія, як «дурань», «хам», «жывёліна», «асёл». Быццам Валянціна правярала, якое з іх зробіць самае моцнае ўражанне на студэнта. У заключэнне Валянціна падсунула пад нос юнаку кепку і кінула:

— Ніякай культуры, навучыся шапку здымаць перад старэйшымі...

Падыходзіць да яе было небяспечна. Мы рашылі спытаць у каго-небудзь іншага. Раптам нашу увагу прыцягнуў нейкі чалавек. Ён закрыў вочы і ледзь чутна шаптаў:



-- Здам, не здам, здам...

Пакруціўшы указальнымі пальцамі, разбёў іх і стаў асцярожна зблiжаць. Пэўна, ад таго, сустрэнуцца між сабой пальцы або не, залежыла многае. Палец правай рукі адхіліўся уверх, левай—няміога уніз—і абодва яны «не сустрэліся». Чалавек пабялеў і засмучана сказаў:

— Так, відаць, не здам...

Вясна рассмяялася.

— Ды гэта-ж аспірант Нікалай Рафальскі! Вось ужо восьмы месяц варожыць, здасць ён кандыдацкі мінімум па замежнай мове ці не...

Трэба прызнацца, што мы расчараваліся: чакалі, што перад намі фокуснік або заклінальнік. Стараючыся застацца непрыкмечанымі і пажадаўшы Рафальскаму паспяховай здачы, мы выйшлі з корпуса.

— Паглядзіце, што гэта такое!—усклікнула Вясна.

Мы самі здзівіліся. Што за цуда: стаіць пажылы чалавек, капае зямлю і сыпле яе у скрыню. Скрыня напоўнілася да палавіны. Чалавек узваліў яе на плечы і накіраваўся да біякорпуса. Вясна спыніла яго. Гэта аказаўся садоўнік Івашын. Ён выцер пот з ілба.

— Пытаеце, куды я зямлю нясу. У аранжарэю універсітэта. Дзе яна? На вышыні... на недасягальнай вышыні.—Ён паказаў на дах біякорпуса.—Хочаце паглядзець...

Мы ўхапіліся за цяжкую скрыню. І пачалося падарожжа. Мінулі першы паверх, другі. І чым вышэй, тым цяжэйшай станавілася ноша. Ногі падкошваліся, моцна білася сэрца...

Нарэшце, мы ля мэты. У аранжарэі спёртае паветра, духата. Напэўна, многа працы каштавала Івашыну, каб заставіць кветкі жыць у гэтай атмасферы. Праўда, кветкі бледныя, але для пачатку добрыя. Работа аранжарэі якраз і адпавядае яе «высокаму» становішчу.




Івашын прыняўся выкладваць свае прэтэнзіі. Гаварыў ён так гладка, што любому наведвальніку было зразумела: такую прамову ён гаворыць не упершыню і паспеў ужо завучыць яе напамяць.

Мы кінуліся у прафком, каб хоць як-небудзь дапамагчы садоўніку. Каля прафкома стаяла чалавек дзесяць. Адзін з іх растлумачыў нам:

— Гэта вахцёры. Бачыце, членаў прафкома вельмі цяжка застаць у кабінеце. Баяцца, каб не залічылі іх у «празасядаўшыхся». Факультэты выдзяляюць дзяжурных, якія, калі толькі хто з'явіцца з прафкома, адразу-ж паведамляюць на факультэт—і тады з'яўляюцца усе, хто жадае сустрэчы са сваімі выбраннікамі.

— Магчыма, яны на факультэтах працуюць?—спытала Вясна.

Студэнт толькі свіснуў.

— Адразу бачна, што вы не з універсітэта. Членаў прафкома вы нідзе не адшукаеце.

Вясна павярнулася да нас.

— Давайце, у камітэт комсамола зойдзем.

У камітэце было многа народу. Амаль усе сабраліся каля стала, за якім засядаў сакратар Е. Бабосаў. Кожны даказваў яму нешта, а ён паварочваўся то да аднаго, то да другога і крычаў:

— Таварышы, давайце-ж па-аднаму.

Мы паспрабавалі прайсці да сакратара. Міхаіл Пільшчыкаў глядзеў на нас пранізваючым позіркам.

— Вы хто такія? Зараз няма прыёму...

Давялося пакінуць пакой.

Ісці побач з Вясной было няёмка. Яна усё прыкмячала, усім цікавалася. Калі-б работнікі універсітэта так унікалі ва ўсе справы, дык у многім быў-бы наведзены парадак.

— Працягваць будзем агляд або закончым?—спыталася Вясна.

— Давайце закончым,—згадзіліся мы.—Толькі чаму вы ўсё на недахопы увагу звяртаеце. Ці няма у нас добрага?

— Многа. Аб добрым вы заўсёды гаворыце...

Вясна прывітальна кіўнула нам галавой і знікла. Знікла, як знікаюць у казцы: быццам растварылася у паветры.

Па-ранейшаму спявалі птушкі, усміхалася сонца, і людзі віталі адзін аднаго «З веснавым прывітаннем!»

**А. ГЕРУС,**
**А. КІЙРАНЕН,**
**Н. БАНДАРЭНКА.**

## СЯБРОЎСКІЯ ШАРЖЫ

*Аспирант Самусевич А.*



*Молод. Статен. Бравый вид.*
*И энергией горит.*
*Много пишет и читает,*
*Диссертацию кончает.*

*Ф. Савицкий—студент II курса филфака*



*Им не зря гордится курс весь—*
*Савицкий там, Савицкий здесь:*
*Он в профбюро, в кружках различных,*
*В оркестре струнном он играет...*
*И Первомай Фаддей встречает*
*Учёбой только на «отлично».*

*Н. Давидовский—комендант общежития, корпуса «А».*




*Он недавно в общежитьи нашем,*
*А много заслужил уже похвал.*
*И мы желаем, чтобы он и дальше*
*Работал так же, как и начинал.*

## ЯНА...

*(гумарыстычнае апавяданне)*

Чытальная зала. Міця Пупыркін, студэнт гістарычнага факультэта, паволі праходзіць між сталамі у дальні кут. Галава яго крыху ўскінута, вочы лянавата прыжмураны. На доўгай танклявай шыі рэзка выпірае кадык.

— Свабодна?—пытаецца ён, параўняўшыся з перадапошнім сталом.

Чубаты хлапец, адрываючыся ад кніжкі, здзіўлена і доўга глядзіць на Пупыркіна: за сталом-жа ён адзін.

— Калі ласка...

Міця кідае на стол кіпу часопісаў, шумна апускаецца на крэсла. Затым глыбокадумна падпірае рукой бараду і журботна пазірае у шырокае акно. На дварэ—лужыны, сонца. Нават у адчыненую фортачку вецер даносіць пах талага снегу і яшчэ нечага—такога чыстага, вясенняга. Здаецца, пахне само блакітнае неба. Добра! Вочы жмурацца ад сонечных промняў. Зрэшты, не толькі ад іх, а яшчэ і ад таго, што учора Міця да трох ночы гуляў у «тысячу». А як цудоўна гулялі! Толькі раптам Міця успамінае аб семінары—і усмешка сходзіць з яго вуснаў. З кіслай, незадаволенай мінай пачынае ён перагортваць часопісы.

Час цягнецца паволі. Поўпустую залу паступова запаўняюць чытачы. І Міця кожнага ўваходзячага праводзіць санлівым позіркам. Потым схіляецца над часопісам. Але радкі, як вада між пальцаў, прасочваюцца і не пакідаюць у памяці ні кроплі ад прачытанага. Міця цяжка уздыхае, праглядае старонку, другую... пакуль сонечны зайчык не падае на яго вузкі, у два пальцы, лоб. Хлопец узнімае галаву — і застывае: ад дзвярэй проста да яго крочыць дзяўчына.

«Дзе яна сядзе?—з'явілася думка у Міці.—Вось, калі-б...» Ды што думаць! Яму усёроўна, дзе цяпер сядзе гэтая дзяўчына: трэба рыхтавацца да семінара. Міця сярдзіта моршчыць лоб і бярэ наступны часопіс.

— Дазвольце...

Яна! Голас дзяўчыны імгненна выводзіць Міцю з санлівага настрою. Ён хуценька ускоквае з крэсла, прапускае яе і садзіцца. Садзіцца неяк ганарліва, яшчэ вышэй ускінуўшы галаву, і з цікавасцю глядзіць на суседку зверху уніз. Круглы ружовы тварык дзяўчыны прыемны. Рукі яе жвава перабіраюць сшыткі, маленькія пухлыя вусны ледзь шавеляцца. «А яна сімпатычная!—адзначае пра сябе Міця і падаўляе уздых: перад носам ляжыць план сённяшняга семінара.—Толькі вось кірпатая...» Прыдзірлівы Міцеў погляд усё больш знаходзіць «недахопаў» у яе твары. І, галоўнае,—касічкі! Ды хто зараз іх носіць? Міця аж пагардліва чмыхае і ужо спакойна дачытвае абзац.

Неўзабаве ён адчувае, што нехта на яго глядзіць. Узнімае вочы—і ловіць на сабе позірк суседкі. Яна чырванее. «Ага,—задаволена смяецца пра сябе Міця,—чым меней мы жанчыну любім, тым падабаемся ёй больш»... І хоць Міця абыякава (так яму здаецца, ва усялякім выпадку) схіляецца над сваім часопісам, але з гэтай мінуты ён ужо не бачыць ніводнага радка. Ён адчувае незразумелае хваляванне і усё часцей косіць вочы у бок дзяўчыны. «Яна нешта хоча сказаць мне. Яна... закахался!»

Міцевы вочы гараць, сэрца моцна б'ецца. Ён не вытрымлівае, рэзка устае і шпарка крочыць да суседняга раду—расказаць усё, як ёсць, аднакурсніку Пятру і... параіцца.

«Пецька! Такое, браток, у мяне, —ледзь сяое стрымліваючы, шэпча Міця.—такое, што...—А праз мінуту, у самае вуха:—Закахалася!»

Пятро здзіўлена і недаверліва глядзіць на сябра. А Міцю—смешна! Не верыць... «Эх!—аж задыхаецца ён.—Дзівак! Назірай вось за намі», — і вяртаецца на сваё месца.

Міця садзіцца і намагаецца не паказаць выгляду, што дзяўчына яго цікавіць: так пакуль лепш. Але гэта у Міці атрымліваецца дрэнна. Ён па-ранейшаму употай пазірае у яе бок і прыкмячае: дзяўчына пільна разглядвае яго канспекты, часопісы. «Хоча прачытаць мае прозвішча,—узбуджана вырашае Міця.—І напісаць... Ды вось! Яна ужо строчыць!»

Сапраўды, дзяўчына нешта піша алоўкам. А Міця, з прытворным роўнадушшам пазіраючы у столь, усхвалявана-радасна чакае. Толькі пальцы нецярпліва барабаняць па стале.

— Вазьміце,—чуе Міця пяшчотны шэпт і—уздрыгвае.

Запіска! Хлопец ліхаманкава бярэ яе, чытае... Але што гэта з ім? Твар Міці адразу неяк цямнее, а ніжняя тоўстая губа бездапаможна ападае да барады. У запісцы чорным па беламу напісана: «Прабачце, калі-ж вы, нарэшце, вызваліце часопіс? Я ужо дзве гадзіны чакаю».

Міця абурана збірае са стала часопісы: пара на лекцыі. А з суседняга раду на яго весела глядзіць аднакурснік Пятро і чагось усміхаецца.

**Яўген Каршукоў.**

**Рэдактар А. ВОЛК.**


Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, пакой 62, тэл. 2-07-19
АТ 02983 Друкарня выдавецтва БДУ. Тыраж 2000 Зак. 515.